# МАСТАЦКАЯ ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ ТВОРЦЫ Ў ЗБОРНІКУ Я. КУПАЛЫ “ЖАЛЕЙКА”

*Н.П. Белавус*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Чытацкае ўспрыманне з’яўляецца неад’емнай часткай спасціжэння і даследавання літаратурных твораў. Рамкі мастацкай сістэмы не абмяжоўваюцца толькі аўтарам і акалічнасцямі напісання твора, а яшчэ ўключаюць і чытача з яго спосабамі ўспрымання. Такім чынам, кожны твор павінен разглядацца ў комплексе “аўтар – чытач”. Пры такім падыходзе твор можна лічыць актыўным рэпрэзентатыўным элементам у працэсе духоўна-эстэтычнага ўзаемадзеяння аўтара з чытачом пэўнай эпохі. У такім разе працэс напісання літаратурнага твора разглядаецца і праз аўтарскае самавыяўленне, і праз мэтанакіраванасць на канчатковых адрасатаў. Мэта дадзенай работы – прасачыць мастацкую інтэрпрэтацыю творцы ў зборніку Я.Купалы “Жалейка”. “Інтэрпрэтацыя (ад лац. interpretatio – тлумачэнне) – вытлумачэнне літаратурнага твора, спасціжэнне яго сэнсу, ідэі, канцэпцыі. Інтэрпрэтацыя ажыццяўляецца як пераафармленне мастацкага зместу, гэта значыць пры дапамозе яго перакладу на паняційна-лагічную мову” [2, 127–128].

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам для аналізу абраны вершы пра творчую асобу са зборніка Я.Купалы “Жалейка”. Пры даследаванні вершаў паэта былі выкарыстаны прыёмы канкрэтна-гістарычнага, кампаратыўнага і дэскрыптыўнага метадаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У 1908 годзе ў Пецярбургу выйшаў з друку першы паэтычны зборнік Янкі Купалы “Жалейка”, вершы якога ствараліся на самым уздыме рэвалюцыйных падзей 1905–1907 гг. Ужо ў гэтым зборніку паэт выпрацаваў адметную сістэму рэпрэзентацыі навакольнай рэчаіснасці, выказаў сваю заклапочанасць як агульнанароднай трагедыяй, так і асабістым жыццём беларуса. Янка Купала не цураўся працы касца, сейбіта і аратага, таму ў вершах першай яго кнігі “Жалейка” вельмі шмат вобразаў, узятых з жыцця земляроба. У вершы “З песень аб сваёй старонцы” паэт пераўвасабляецца ў прыгнечанага селяніна, ад імя якога скардзіцца на цяжкі лёс: “Невясёлая старонка / Наша Беларусь / Людзі: Янка ды Сымонка, / Птушкі: дрозд ды гусь. / Поле: горы ды каменне, / Потам зліта ўсё, / Сенажаць – адно карэнне, / Сівец ды куп’ё” [1, 3]. Такое проста-сялянскае ўяўленне аб жыцці патрабавала ад аўтара гутарковай манеры выказвання. Каб адпавядаць асноўнай задуме вершаў, нараджаецца і пэўная форма выказвання думак аўтара: маналог ад першай асобы здольны выяўляць змест лагічна, выразна і дакладна. Як, напрыклад, і ў вершы “Я мужык-беларус”: “Я мужык-беларус, – / Пан сахі і касы; / Цёмны сам, белы вус, / Пядзі дзве валасы. / Бацькам голад мне быў, / Гадаваў і карміў; / Бяда маткай была, / Праца сілу дала” [1, 6].

У вершах ранняга перыяду, што склалі змест “Жалейкі”, Я.Купала ў асноўным праяўляе сябе як выразнік сялянскіх дум. Але нельга не ўлічваць той факт, што яго эстэтычныя і мастацкія прынцыпы вызначаліся праблемамі народа і ўзнікалі на нацыянальна-вызваленчай глебе. Так, у вершы “Песня а песнях” народны пясняр выказвае мару народа пра свабоду і заклікае змагацца за лепшую долю: “Братцы Беларусы, / Барукайцеся смялей, / З няпраўдай, з пакусай. / Блізкі той дзянёк, калі / Шчасна запануем, / Станем самі мы людзьмі, / І край адбудуем” [1, 42].

Вялікую цікавасць у зборніку выклікае цыкл вершаў “З песняў беларускага мужыка”. Тут Янка Купала імкнецца як мага шырэй адчуць сябе ў вобразе селяніна, галоўнае прызначэнне якога – праца на багатых людзей (верш “Шумныя бярозы”): “Марозам марозіць, / Снегам адзяе, / На работу гоніць, / Есці не дае” [1, 8]. Але побач, у вершы “Я – багач, я – магнат”, вобраз таго ж мужыка, што прымярае на сабе аўтар, выступае рэзкім кантрастам. Абуджаны ўсведамленнем сваёй дужасці (“Я – багач, я – магнат! – / Усім рад, усім сыт! – / Што мне пан, што мне кат?! – / Цэлы свет мне адкрыт!”), герой верша імкнецца асіліць гора-бяду: “З гор зраблю даліну, / а з далінкі гару! / Затрымаю ваду, / Цёмны бор павалю, / А як з сошкай пайду, – / Увесь свет накармлю!” [1, 5]. Выразным разладам мары і рэчаіснасці паэт уводзіць у свае вершы драматычную лінію, якая дапамагае надаць лірычным творам грунтоўнасці і суровасці.

Рэпазіторый ВДУ

Галоўным героем Купалы, як бачым, станавіўся чалавек працы, характар якога ён і імкнуўся на сябе прымяраць.

У зборніку два цэнтральныя вобразы: селянін, убачаны вачамі паэта, і творца. Янка Купала па-майстэрску падбіраў формы сваіх вершаў. Сярод іх: зварот-заклік да мужыка (“Эй, скажы, мужычок”), давяральная размова з селянінам (“На добры, стары лад”), папярэджанне пану (“Пашкадуй мужыка”). Але найбольш майстэрства паэта праявілася ў вершах-маналогах, дзе лірычны герой, здольны да творчага самавыяўлення, прадстае то маладзёнам, то старцам, і касцом, і сейбітам, і шаўцом.

“Жалейка” адкрывалася вершам “Я не паэта”, праграмным творам, дзе была закладзена праграма пісьменніцкай дзейнасці Купалы: быць песняром народа: “Шчасце так рэдка над светам усходзе; / Ўсё ж досыць бывае меці хоць мала, – / Долю каб бачыў у родным народзе, / А быў бы шчаслівы Янка Купала” [1, 1]. Аўтар зборніка паэтызуе вобраз песняра, які ідзе побач з мужыком. І ў вышэй названым вершы, і ў вершы “Я не сокал” ці “Хто я?” Купала так гаворыць пра сябе, каб паказаць сціпласць абранага ім прафеййнага шляху: “Я не паэта, о крый мяне Божэ! / Не рвуся я к славе гэткай ні мала” – верш “Я не паэта” [1, 1]; “Я не сокал зоркавокі, / Не арол адважны, / Што так думна за аблокі / Ўзносіцца з іх кажны. / Нават я не салавейка, / Што пяе так слоўна, / А я толькі верабейка, / Ўзрошчаны над Гайнай” – верш “З маіх думак” [1, 63]. Паэт жадае паказаць сябе роўным мужыку, толькі з адным адрозненнем: талент, дараваны прыродай, выцягвае яго на творчыя прасторы. Янка Купала заявіў пра сябе як прадаўжальнік рамантычнай традыцыі ўвасаблення творцы, дзе творца – выразнік народных памкненняў, а творчасць – магутная нацыятворная сіла. Народны пясняр, здольны аб’яднасць грамадства, услаўляўся паэтам ў вершы “Песня а песнях”: “Кепскі з нас той гаспадар, / Што не мае хлеба; / І без песень жа народ / Што ён варт быць можа” [1, 41]. Творца ў Янкі Купалы – асветнік: “Дык пець буду табе, людзе, / Каб працёр ты вочы” [1, 51]. Творчая асоба ў беларускага паэта часта прадставала ў абліччы вандроўнага народнага музыкі, што сваім мастацтвам кліча да лепшага жыцця (верш “Як пайду, я пайду…”). У вершы “Адзін”, напісаным у форме маналога, лірычны герой наракае на духоўную адзіноту, на адсутнасць узаемаразумення з тымі людзьмі, інтарэсы якіх ён імкнецца выказваць: “Напрасна прывету чакаю, / Напрасна вітаю, пяю” [1, 77]. Такім чынам, ужо ў вершах першага зборніка Янка Купала звярнуўся да асэнсавання праблемы “творца – народ”, якая атрымае глыбокае асэнсаванне ў яго паэме “Курган”.

Пра гэта і Купалаў верш “Думкі”: “Пакірую думкі ў тую / Старонку свае, / Скуль з прасветам мне прыветам / Праўда запяе. / Далей, вышай памкну, гэй жа: / Ўжо праложан след; / Трудна, маці, ў курнай хаце, – / Паляту ў свет!” [1, 61].

**Заключэнне.** Мастацкая інтэрпрэтацыя вобраза творцы ў першым зборніку Янкі Купалы была адным з важных сродкаў рэпрэзентацыі ўласнай эстэтычнай праграмы, заснаванай на дэмакратычных, гуманістычных, адраджэнскіх ідэях. Вобраз творцы асэнсоўваўся галоўным чынам у вершах-маналогах лірычнага героя, духоўна блізкага аўтару. Купалаў творца прадстаўў пераважна ў абліччы паэта-грамадзяніна, паэта-дэмакрата, які свядома абвяшчае сябе выразнікам памкненняў беларусаў, будзіцелем іх чалавечай годнасці і нацыянальнай самасвядомасці, а таксама ў абліччы народнага музыкі, які выяўляе мары і памкненні сваіх суайчыннікаў. У мастацкай трактоўцы вобраза творцы Янка Купала яшчэ моцна абапіраўся на ідэі эстэтыкі еўрапейскага рамантызму і на прыёмы рамантычнага ўвасаблення творчай асобы, якая, паводле рамантыкаў, адчувае сваё адзіноцтва, бо маральна і інтэлектуальна ўзвышаецца на фоне астатніх людзей.

*Спіс літаратуры*

1. Купала, Я. Жалейка : вершы. Факсімільнае выданне / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 1982. – 162 с.
2. Литературный энциклопедический словарь / под ред. В.М.Кожевникова, П.А.Николаева. – М.: Советская энциклопедия, 1987. – 751 с.

Рэпазіторый ВГУ